# КРАЯЗНАЎЧАЯ ФУНКЦЫЯ БІБЛІЯТЭКІ
# ЯК САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА ІНСТЫТУТА ГРАМАДСТВА

**Стрыжонак І.М., дацэнт БДУ культуры і мастацтваў**
**Саітава В.І., кандыдат педагагічных навук, дацэнт БДУ культуры і мастацтваў**

Для развіцця бібліятэчнай навукі канца XX – пачатку XXI ст. характэрна павышэнне ўвагі да вывучэння тэарэтычных праблем бібліятэказнаўства, у тым ліку, вызначэнне сутнасці бібліятэкі як сацыяльна-культурнага інстытута, яе місіі, сацыяльнай ролі і сацыяльных функцый.

Бібліятэказнаўцы Ю.М.Сталяроў [1], В.В. Скварцоў [2], Астапаў [3], Акіліна [4], Н.В.Жадзько [5], Маркава [6], Р.М.Матульскі [7] разглядаюць бібліятэку як асобую інфармацыйную, дакументна-камунікацыйную сістэму, як камунікатыўна-пазнавальны інстытут, як “сімвал культуры” і фундамент асветы і культуры, звяртаюць увагу на яе гуманітарную сутнасць. Так, В.В. Скварцоў вызначаў бібліятэку як спецыяльную ўстанову, якая ажыццяўляе індывідуальнае па форме арганізацыі забеспячэнне грамадскіх патрэб у інфармацыі, якая змешчана ў яе фондзе. Бібліятэка – гэта інфармацыйная сістэма, якая прадстаўляе грамадству сканцэнтравання ў ёй інфармацыйныя рэсурсы [2, с. 7]. Ю.М. Сталяроў таксама бачыў сутнасць бібліятэкі ў задавальненні інфармацыйных патрэб і разглядаў яе як абслугоўваючую фізічных і юрыдычных асоб дакументна-камунікацыйную сістэму [1, с. 3; 9, с. 57]. Бібліятэку вызначалі і як інфармацыйную і культурную прастору. Так, Н.В.Жадзько падкрэслівае, што бібліятэка прадстаўляе сабой “механізм сацыяльнай камунікацыі”. На яе думку, бібліятэка як сацыяльна-культурны інстытут грамадства ўключае ў сваю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дзейнасць два пласты: сацыяльны і культурны. У сацыяльным плане бібліятэка з'яўляецца адным з сродкаў забеспячэння сацыяльнай камунікацыі; у культурным – бібліятэка выконвае "гістарычную трансляцыю ведаў у рамках культурнай камунікацыі" [5]. Такім чынам, абагульняючы погляды бібліятэказнаўцаў на сутнасць бібліятэкі, неабходна выдзеліць вызначэнне бібліятэкі як сацыяльнага інстытута грамадства, які забяспечвае сацыяльную і культурную камунікацыю паміж дакументам і карыстальнікам.

У апошні час увага спецыялістаў (С.Г. Матліна [8], Н.Я. Дабрыніна [9], М.Я. Дворкіна [10], Л.Н. Гусева [11], В.В. Скварцоў [12] і інш.) прыцягвала такая агульнатэарэтычная, філасофская праблема, як вызначэнне зместу паняцця "місія бібліятэкі". Шматлікія выказванні адносна гэтага паняцця можна аб'яднаць у двух кірунках: 1) разгляд місіі бібліятэкі як катэгорыі філасофіі бібліятэкі. Прыхільнікі гэтага кірунку разглядаюць місію бібліятэкі як катэгорыю вышэйшага парадку ў параўнанні з паняццем "сацыяльная роля" і "сацыяльная функцыя", як вышэйшую ідэю яе прызначэння, "супер мэту" бібліятэкі, ключавое паняцце філасофіі бібліятэчнай справы. 2) Другі кірунак заснаваны на сцвярджэнні, што паняцце "місія бібліятэкі" не змяшчае нічога новага. Яно толькі сінонім паняццяў "сацыяльнае прызначэнне" і "сацыяльная роля" бібліятэкі.

Большасць спецыялістаў вызначае паняцце "місія бібліятэкі" як катэгорыю больш высокага ўзроўня ў параўнанні з паняццямі "назначэнне", "роля" бібліятэкі і лічаць, што ў змесце паняцця "місія" прысутнічае нешта агульнае, уласцівае ўсім бібліятэкам незалежна ад часу і прасторы, а тым больш ад сацыяльна-эканамічнага і ідэалагічнага становішча канкрэтнага грамадства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі місія вызначае мэту дзейнасці бібліятэкі, то сацыяльная роля і сацыяльныя функцыі – гэта шляхі, спосабы, метады дасягнення гэтай мэты, механізм яе рэалізацыі. Гэтыя суадносіны магчыма прадставіць у форме канцэнтрычных кругоў: дзе ў цэнтры размешчана агульнае, інварыянтнае, уласцівае бібліятэцы наогул – яе місія; па перыферыі будзе размяшчацца сацыяльная роля бібліятэкі, якая змяняецца ў часе і прасторы; у знешняй акружнасці змяшчаюцца сацыяльныя функцыі бібліятэкі, змест якіх вызначаецца місіяй бібліятэкі, але непасрэдна звязаны і залежыць ад сацыяльнай ролі бібліятэкі.

Сацыяльныя функцыі – адна з найбольш распрацаваных тэарэтычных праблем бібліятэказнаўства. Аб актуальнасці і значнасці праблемы сведчаць бесперапынныя спробы ўдакладнення складу сацыяльных функцый і суадносін паміж імі. Праблемам сацыяльных функцый бібліятэк былі прысвечаны працы М.І. Акілінай [13], А.Н.Ванеева [14], Н.Я.Дабрынінай [15], В.В.Скварцова [16], А.І.Пашына [17], Е.Т.Селіверставай [18], Н.І. Цюлінай [19], Р.С.Матульскага [20] і інш. Спецыялісты класіфікуюць функцыі бібліятэкі на сацыяльныя і тэхналагічныя. У ліку сацыяльных функцый выдзяляюць сутнасныя, тыпаўтвараючыя, вытворныя (дадатковыя) сацыяльныя функцыі. Напаўняльнасць сацыяльных функцый вызначаецца той сацыяльнай роляй, якую выконвае рэальная бібліятэка ў канкрэтны храналагічны адрэзак.

На працягу апошняга дзесяцігоддзя ў спецыяльнай літаратуры шырока абмяркоўваецца пытанне аб тым, што ў сучасных умовах сацыяльныя функцыі бібліятэк змяняюцца: змяняецца іх змест, ўзнікаюць новыя сацыяльныя функцыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з такіх функцый з’яўляецца “краязнаўчая функцыя бібліятэкі”. Тэрмін “краязнаўчая функцыя бібліятэкі” ўвёў Б.Ф.Валодзін [21]. Сутнасць гэтай функцыі ён бачыць у стварэнні рэгіянальнай памяці – дакументнай і інфармацыйнай, а таксама ў каардынацыі дзейнасці бібліятэк і іншых сацыяльных інстытутаў па краязнаўстве. Б.Ф.Валодзін падкрэслівае, што краязнаўчая функцыя з’яўляецца галоўнай, вызначальнай у дзейнасці абласных бібліятэк, бібліятэк рэгіянальнага ўзроўню. Гэта функцыя знаходзіцца ў арганічнай еднасці з інфармацыйнай, культурна-асветнай і адукацыйнай сацыяльнымі функцыямі. Э.К.Бяспалава вызначыла гэту функцыю як канкрэтызацыю грамадскага прызначэння бібліятэкі [22]. Н.Н.Кушнаренка разглядае краязнаўчую функцыю як вытворную ад прыкладных сацыяльных функцый бібліятэкі [23]. Нешматлікасць выказванняў спецыялістаў сведчыць аб тым, што вывучэнне краязнаўчай функцыі бібліятэк толькі пачынаецца. Цалкам справядліва Н.Н.Кушнаренка аднесла краязнаўчую функцыю да прыкладных, так як яна мае выразнае практычнае значэнне: краязнаўчая функцыя фактычна пранізвае ўсе кірункі бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці. Краязнаўчую функцыю магчыма паспяхова разглядзець адносна да чатырох асноўных элементаў бібліятэкі як сістэмы. У бібліятэках рэальна існуюць: краязнаўчыя фонды; кантынгент карыстальнікаў дакументаў і бібліяграфічнай інфармацыі па краязнаўстве; бібліятэчны персанал, уключаны ў краязнаўчую работу, у т.л. у абласных бібліятэках і некаторых ЦБС кадры бібліятэкараў-бібліёграфаў працуюць у краязнаўчых аддзелах і сектарах; матэрыяльна-тэхнічная база па краязнаўстве. Магчыма зрабіць выснову, што краязнаўчая функцыя – гэта функцыя інтэгральная. Яна аб’ядноўвае ў цэлае ўсе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

элементы сістэмы “бібліятэка” і ў той жа час раскрывае канкрэтны сэнс, змест кожнага элемента з улікам краязнаўчай спецыфікі: краязнаўчы дакумент змяшчае краязнаўчыя веды і інфармацыю; бібліятэчны персанал выконвае апрацоўку краязнаўчых дакументаў, стварае другасны (бібліяграфічны) узровень прадстаўлення дакументаў, якія маюцца ў фондзе бібліятэкі і па-за межамі бібліятэкі, у т.л. у аддаленым доступе. Карыстальнік выкарыстоўвае краязнаўчыя дакументы і краязнаўчую бібліяграфічную інфармацыю. Акрамя таго, краязнаўчы дакумент – гэта яшчэ і матэрыяльны носьбіт; аб’ект, які мае сваю цану і набыты бібліятэкай за аплату, таму ён з'яўляецца часткай краязнаўчага фонду і МТБ бібліятэкі. Усе пералічаныя элементы (падсістэмы) з’яўляюцца агульнасістэмнымі і ў даным выпадку падначалены адной функцыі – краязнаўчай. Аднак кожны элемент (падсістэма) раскрывае змест краязнаўчай функцыі па-свойму. Такім чынам лагічна зрабіць выснову, што ўсе агульнасістэмныя элементы (падсістэмы) інтэграваны, падначалены краязнаўству.

Краязнаўчая функцыя не з’яўляецца асноўнай, сутнаснай (ці іманентнай) функцыяй бібліятэкі. Яна прасякае ўсе элементы сістэмы “бібліятэка” і выконваецца ўсімі імі адначасова. Праз краязнаўчую функцыю, з дапамогай разнастайных форм і кірункаў дзейнасці бібліятэка рэалізуе сваё прызначэнне па задавальненні краязнаўчых інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, стварэнню адпаведных рэсурсаў і забеспячэнні гарантаванага доступу да іх карыстальнікаў. Краязнаўчая функцыя бібліятэкі з’яўляецца вытворнай, дапаможнай, як і астатнія сацыяльныя функцыі бібліятэкі, за выключэннем асноўнай сутнаснай (іманентнай) функцыі. Краязнаўчая функцыя існуе на ўзроўні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праяўлення. Найбольш поўна гэта праяўленне рэалізуецца праз наданне бібліятэкай прыярытэтнага значэння краязнаўству ў фондафарміраванні, вядзенні каталогаў і картатэк, баз даных, падрыхтоўцы бібліяграфічных дапаможнікаў, абслугоўванні карыстальнікаў, навукова-метадычнай дзейнасці, папулярызацыі краязнаўчых ведаў, удзел бібліятэкараў у краязнаўчых даследаваннях і інш.

З'яўляючыся суб'ектам сістэмы сацыяльна-культурных камунікацый, бібліятэка ажыццяўляе трансляцыю краязнаўчых сацыяльна значных ведаў і інфармацыі, якія падвяргаюцца мэтанакіраванаму ўпарадкаванню і рэгуляванню. У змястоўным сэнсе краязнаўчая дзейнасць бібліятэкі суадносіцца з 4 асноўнымі інфармацыйнымі кірункамі сістэмы сацыяльна-культурных камунікацый: навацыйным (перадача спажыўцам новых краязнаўчых ведаў з дапамогай усяго арсенала форм і метадаў узаемадзеяння з карыстальнікамі, якія сёння выкарыстоўваюцца ў бібліятэцы); арыентацыйным (бесперапынная каштоўнасная арыентацыя карыстальнікаў у свеце краязнаўчых дакументаў, навучанне свабоднай арыентацыі ў сістэме першасных і другасных краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэкі і інш.); стымуляцыйным (дзейнасць бібліятэкі па краязнаўстве накіравана на ўзбагачэнне ведаў насельніцтва і асобных індывідуумаў аб сваім краі, на ўзвышэнне духоўных патрэбнасцей, патрыятычнае выхаванне, на фарміраванне інфармацыйна-рэгіянальнага стылю мыслення мясцовых эліт); карэляцыйным (пераадоленне некаторых камунікатыўных бар'ераў, ад недаверу бібліятэкару і псіхалагічных перашкод да дапамогі карыстальнікам ва ўдакладненні іх запытаў, патрэбнасцей, у выбары рэлевантных краязнаўчых дакументаў і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Суаднясенне базавых узроўняў сацыякультурнай камунікацыі: стыхійнай, нефармальнай і інстытуцыяналізаванай камунікацыі з краязнаўчай дзейнасцю бібліятэк, паказвае, што гэта дзейнасць працякае на ўсіх ўзроўнях, пачынаючы ад міжасабовых кантактаў да электроннай сеткавай камунікацыі. І калі асноўная сацыяльная функцыя сацыякультурнай камунікацыі вызначаецца тым, што апошняя з'яўляецца сродкам ажыццяўлення сацыякультурнага ўзаемадзення суб’ектаў, то і праяўленне краязнаўчай сацыяльнай функцыі садзейнічае абмену рэгіёназнаўчымі ведамі і інфармацыяй у соцыуме; развіццю ўзаемадзеяння суб’ектаў камунікацыі; назапашанню і трансляцыі дакументаваных краязнаўчых ведаў, мясцовага сацыяльнага вопыту, перапрацаваных і ацэненых з пазіцый каштоўнасцей грамадства і рэгіянальнай супольнасці у канкрэтна-гістарычны перыяд.

**Спіс выкарыстанных крыніц**


1. Столяров, Ю.Н. О сущности библиотеки / Ю.Н. Столяров // Библиотековедение. – 1994. - № 5. – С. 3 – 10.

2. Скворцов, В.В. Теоретические основы библиотековедения: учеб. / В.В. Скворцов. – М., 1996. – С. 7.

3. Остапов, А.И. К созданию высокоинтеллектуальной библиотеки / А.И. Остапов // Библиотековедение. – 1995. - №1. – С. 116-120.

4. Акилина, М.И. Сущностная природа библиотеки / М.И. Акилина // Библиотековедение. – 1991. - №5/6. – С. 132-135.

5. Жадько, Н.В. Анализ сущностных характеристик библиотеки как социокультурного института / Н.В. Жадько // Библиотековедение. – 1996. - № 3. – С. 54 – 64.

6. Маркова. Т.Б. Библиотека как феномен культуры: автореф. дис. … канд. филос. наук / Т.Б. Маркова; СПбГУ. – СПб., 1999. – 16 с.

7. Мотульский, Р.С. Библиотека как социальный институт / Р.С. Мотульский. – Мн.: Бел. гос. ун-т культуры, 2002. – С. 53-75.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Матлина, С.Г. Заметки на полях «философских статей» в журнале «Библиотековедение» / С.Г. Матлина // Библиотековедение. – 1996. - № 4/5. – С. 101-110.

9. Библиотечное дело на пороге XXI века: тез. докл. и сообщ. междунар. науч. конф. – М., 1998. – Ч. 1. – 152 с.

10. Дворкина, М.Я. Библиотечное обслуживание: Новая реальность: лекции / М.Я. Дворкина; МГУКИ. – М.: Профиздат, 2000. – 48 с. – (Серия «Современная библиотека»).

11. Гусева, Л.Н. Библиотековедение: нормативный подход (понимающая парадигма мышления) / Л.Н. Гусева, Е.В. Смолина; РНБ. – СПб., 1997. – 207 с.

12. Карташов, Н.С. Общая теория библиотечного дела: учеб. / Н.С. Карташов; МГУК. – Ч. 2. – М.. 1997. – 256 с.

13. Акилина, М.И. Информационная функция как понятие / М.И. Акилина // Библиотека. – 199. - № 10. – С. 30-32.

14. Библиотеки — обществу: на пороге нового века: К 10-летию библиотечного демократического движения в России: сб. ст. / сост. Б.Ф. Володин; петербургское библиотечное о-во. – СПб., 1999. – С. 67-172.

15. Библиотечное дело на пороге XXI века: тез. докл. и сообщ. междунар. науч. конф. – М., 1998. – Ч. 1. – С. 33-35.

16. Скворцов, В.В. Библиотековедение вчера, сегодня, завтра: (полемические заметки) / В.В. Скворцов // Библиотековедение. – 1996. - № 4/5. – С. 37-45.

17. Библиотековедение вчера, сегодня, завтра: тез. докл. и сообщ. науч. конф. – М., 1996. – Ч. 1. – С. 21-24.

18. Селиверстова, Е.П. О функциях библиотек / Е.П. Селиверстова // Библиотека. – 1992. - № 1. – С. 27 – 29.

19. Тюлина, Н.И. Информационная функция библиотеки / Н.И. Тюлина // Библиотековедение. – 1997. - №1. – С. 3-11.

20. Мотульский, Р.С. Библиотека как социальный институт / Р.С. Мотульский. – Мн.: Бел. гос. ун-т культуры, 2002. – С. 136-187.

21. Володин, Б.Ф. Споры вокруг перспектив / Б.Ф. Володин // Библиотекарь. – 1989. - № 5. – С. 26 – 29.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

22. Беспалова, Э.К. Функции библиотечной и библиографической систем / Э.К. Беспалова // Науч. и техн. б-ки СССР. – 1984. - № 6. – С. 27 – 38.

23. Кушнаренко, Н.Н. Библиотечное краеведение: теоретико-методологический аспект: автореф. дис. … д-ра пед. наук. / Н.Н. Кушнаренко; МГИК. – М., 1993. – 16 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ